**“Вялікі пост: час пакаяння”.**
**Духоўна-асветніцкая гутарка.**
**13.02.2024**



Напярэдадні вялікага свята Вялікадня наведвальнікі клуба “Бяседа”, які працуе ў аддзяленні дзённага знаходжання грамадзян сталага ўзросту ДУ “ТЦСАН Ашмянскага раёна”, сустрэліся са святаром касцёла Святога Міхаіла Арханёла г.Ашмяны Паўлам.

Пад час сустрэчы адбылася духоўна-асветніцкая гутарка “Вялікі пост: час пакаяння”. Ксёндз Павел звярнуў увагу прысутных на важнасць свята, вёў размову пра духоўную падрыхтоўку да яго, адказваў на пытанні. Ён адзначыў, што Вялікдзень, Пасха, Паска — галоўная падзея царкоўнага календара, найстаражытнае і найважнейшае хрысціянскае свята. Тыдзень Святога Вялікадня называецца Велікодным, вялікім і радасным. Першы дзень Пасхі ў беларусаў называецца Вялікдзень. У гэты дзень адзначаецца светлае Хрыстова Уваскрасенне - перамога над смерцю і ачышчэнне ад усіх грахоў. Вялікдзень - пераходнае свята, гэта значыць, што кожны год яно святкуецца ў розныя даты. Дакладная дата Вялікадня вылічаецца з дапамогай месяцовага календара. Таксама ксёндз Павел паведаміў пра тое, што пры падрыхтоўцы да свята на першым месцы павінна быць малітва, а напярэдадні ўрачыстаці неабходна прывесці ў парадак свае думкі і супакоіць душу.





Закончылася спатканне сумесным чаяваннем і спробай выпечкі, якую падрыхтавалі нашы наведвальнікі.

Тэрэса Кошань
спецыяліст па сацыяльнай рабоце
ДУ “ТЦСАН Ашмянскага раёна”